

ЯК «ВЫЦЯГНУЦЬ» ДЗІЦЯ СА СМАРТФОНА 13

ПАСЛУХАЦЬ ЦЫМБАЛЫ І ГАРМОНІК... 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА +TV ПРАГРАМА

10 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 112 (29734)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Якія б перыпетыі ні адбываліся каля нашых меж, які б ціск на краіну ні аказвалі знешнія сілы, задача дзяржавы застаецца нязменнай — ствараць умовы для годнага жыцця грамадзян, слухаць і чуць іх запыты. Менавіта ў гэтым залог народнага даверу, без якога не можа быць прарыўнога развіцця краін».*

## КОРАТКА

- **Новае свята — Дзень бацькі — устаноўлена ў Беларусі 21 кастрычніка. Адпаведны Указ № 198 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**
- Арыентаваны на экспарт малы і сярэдні бізнес зможа атрымаць ад Банка развіцця крэдыт пад 7,5 %.
- **Прадпрыемства па вытворчасці сучасных лекаў з плазмы крыві пабудуюць у Ганцавічах.**
- Абмежаванне на наведванне лясоў уведзена ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці.
- **У Беларусі будуць працягвацца тэрміны рэалізацыі інвестпраектаў.**
- Максімальны ўзрост донараў крыві плануюць павялічыць да 65 гадоў.
- **Венесуэла зацікаўлена ў рэалізацыі сельгаспрадукцыі праз БУТБ.**
- У Бабруйску мужчыну стукнула токам падчас лоўлі рыбы непадалёк ад лініі электраперадачы.
- **Трохгадовая дзяўчынка выпала з акна шостага паверха ў Баранавічах. Дзіця з траўмамі даставілі ў бальніцу.**

# Лета, коні і пяшчота



Студэнтка другога курса Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Кацярына БЕЛАВУСАВА як валанцёр дапамагае даглядаць коней на аграсядзібе «Ранча Дзіяны» ў вёсцы Лапы Бешанковіцкага раёна. Сама Кацярына з Салігорска, з малення любіць гэтых жывёл, а прыязджае на ранча пяты месяц. Аграсядзібаўскі табун налічвае больш за дзесяць асобін, Кацярына дапамагае іх карміць, чысціць, выгульваць, прыбіраць стойлы, аказваць дапамогу ў ветэрынарных маніпуляцыях, падрыхтоўваць коней да спартыўных скачак, праводзіць сеансы іпатэрапіі — катае дзяцей і дарослых, вучыць верхавой яздзе.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Паехалі!

## ПРЫДАРОЖНЫЯ АБ'ЕКТЫ ЯК МЕСЦА ДЛЯ БАЎЛЕННЯ ЧАСУ

### Сучасны сэрвіс уздоўж дарог Беларусі павялічвае прапановы

**Беларускія транспартнікі імкнуцца да комплекснага развіцця аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, дзе можна было б адпачыць усёй сям'ёй, а забаўкі для сябе маглі б знайсці і дзеці, і хатнія гадаванцы. Аднак пакуль такія аб'екты найчасцей утылітарныя: прыехаў-запраўвіўся-паеў-паехаў. А вось сучасныя аўтазаправачныя станцыі краіны сёння ўжо становяцца не проста месцам для запраўкі, а шматфункцыянальнымі комплексамі. Сёлета ў сталічным рэгіёне з'явяцца дзве новыя АЗС, каля дзясятка аб'ектаў у краіне будуць маштабна рэканструяваны, а насамрэч — амаль збудаваны нанова, каля 40 — мадэрнізуюць. Як развіваецца прыдарожны сэрвіс у Беларусі, расказалі эксперты.**

### КРЫТЭРЫІ ЗРУЧНАСЦІ

Яшчэ ў 2011 годзе абавязковым патрабаваннем да аб'екта прыдарожнага сэрвісу ў Беларусі стала наяўнасць умоў для перасоўвання людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Такое патрабаванне існуе не ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Цяпер гэтыя правілы выконваюцца на новых і тых, якія рэканструіруюцца, аб'ектах — як на іх тэрыторыі (стаянкі, паркоўкі, пады́ходы), так і ўнутры будынкаў і санітарных збудаванняў, расказаў **Сяргей ЛЯВОНЧЫК, начальнік упраўлення развіцця аўтамабільных дарог галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый.**

СТАР. 3

Моцныя рэгіёнамі

## ПА НОВЫЯ ЎРАЖАННІ — НА ГОМЕЛЬШЧЫНУ:

### найлепшае з друкаванага слова, турыстычны каларыт і фестывальны дух...

**Аб знакавых праектах Года гістарычнай памяці Гомельскага рэгіёна размаўляем з намеснікам старшыні абласнога выканаўчага камітэта Уладзімірам ПРЫВАЛАВЫМ.**

***— Дзень беларускага пісьменства 2022 абяцае стаць знакавай падзеяй не толькі для яго сёлетняй сталіцы — Добруша, але і ў цэлым для культурнай, турыстычнай прасторы Гомельшчыны. Як рэгіён рыхтуецца да свята літаратурных традыцый і духоўнасці беларускага народа?***



Фота «Гомельскай праўды».

— Сапраўды, сёлета Гомельскай вобласці выпаў гонар працягнуць святочную нацыянальную традыцыю, стаць пунктам прыцягнення пісьменнікаў, аматараў друкаванага слова, удзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «МЫ ГАТОВЫ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМ МАДЭРНІЗАЦЫІ КЛЮЧАВЫХ СЕКТАРАЎ ЭКАНОМІКІ КУРСКАЙ ВОБЛАСЦІ»

## Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з губернатарам Курскай вобласці Раманам Старавойтам

**Аляксандр Лукашэнка запэўніў суразмоўцу, што Беларусь гатова ўдзельнічаць у рэалізацыі праграм мадэрнізацыі ключавых сектараў эканомікі Курскай вобласці, а асабліву ўвагу неабходна ўдзяліць партнёрству ў будаўніцтве, прамысловай каапераціі і АПК.**

«Курская вобласць з'яўляецца вельмі важным гандлёва-эканамічным партнёрам для нас. І асабліву ўвагу нам неабходна засяродзіць на найбольш перспектыўных кірунках узаемадзеяння — будаўніцтве, прамысловай каапераціі, аграпрамысловым комплексе, дзе ёсць рэзервы, якія не задзейнічаны. Мы гатовы ўдзельнічаць у рэалізацыі праграм мадэрнізацыі ключавых сектараў эканомікі Курскай вобласці. Асабліва згодна з тым планам, які вы распрацавалі на дзесяцігоддзі. Думаю, што Беларусь знойдзе сваё месца ў рэалізацыі гэтых планаў», — сказаў кіраўнік краіны.

Курскую вобласць Прэзідэнт назваў блізкім рэгіёнам Расійскай Федэрацыі для нас, нягледзячы на тое, што за гады не дасягнулі велізарных вышынь у тавараабароце. «Толькі 205—210 мільёнаў долараў, але мы бачым істотны прырост. Апошнія гады мы на 22 працэнты дзесьці дадалі ў тавараабароце. Гэта нармальна. Нюанс адзін — у нас адмоўнае сальда. Але мы гатовы нівеліраваць гэты недахоп. Галоўнае — ёсць чым. Мы вельмі ўдзячныя за той інтарэс, які вы праяўляеце да развіцця супрацоўніцтва з нашай краінай», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заклікаў прамыслоўцаў Курска пераходзіць ад простага гандлю да стварэння сумесных вытворчасцяў. Перспектыўным уяўляецца стварэнне сумесных прадпрыемстваў, пачынаючы са зборкі тэхнікі, што неабходна будзе ў гэтым расійскім рэгіёне.

Прапанаваў Прэзідэнт айчынны паспяховы вопыт у рэалізацыі кааперацыйных праектаў па выпуску амаль усёй тэхнікі — трактароў, камбайнаў, сельгас-, аўтатэхнікі.

Паводле слоў кіраўніка краіны, беларусы маюць неабходныя рэсурсы для ўдзелу ў праграмах імпартазамяшчэння. «Мы з Прэзідэнтам Пуціным (Уладзімірам. — **«Зв.»**) нядаўна прынялі такое рашэнне. З нашага боку мы прапанавалі канкрэтныя праекты расіянам, якія вельмі неабходны будуць у найбліжэйшы час не толькі ў Беларусі, але і ў Расійскай Федэрацыі. Для гэтага расіяне выдаткоўваюць каля 1,5 мільярда долараў на гэтыя праграмы толькі на тэрыторыі Беларусі. Мы разумеем, што без імпартазамяшчэння, асабліва па крытычных галінах, так званага крытычнага імпарту, нам будзе вельмі складана развівацца. Спадзявацца толькі на Кітай і на тое, што ён нас забяспечыць, сёння нельга, бо ён можа не справіцца з такімі аб'ёмамі. Неабходна ўсё ж такі развіваць сваю эканоміку і сваю прамысловасць», — сцвярджаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ў нарошчванні паставак у Курскі рэгіён кар'ернай, сельскагаспадарчай, будаўнічай, дарожнай тэхнікі, грузавых аўтамабіляў. Прэзідэнт прапанаваў наведаць гасцям і выстаўку «Белагра». «Калі вы не былі, неабходна, каб калегі вашы паглядзелі. Там сельгасмашынабудаванне, перапрацоўка і племянная справа, раслінаводства, насенневодства — усё прадстаўлена. Можна паглядзець. Калі ў вас будзе нейкі інтарэс у гэтым плане, мы з задавальненнем падключымся да рэалізацыі гэтых праектаў у вашым рэгіёне», — сказаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт падкрэсліў: ведае планы Курскай вобласці ўвайсці ў дзясятку найлепшых рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі па тэмпах развіцця. «Годна! Хацелася б, каб нашы суседзі гэта месца занялі. Чым вышэй, тым лепш. Мы гатовы ўдзельнічаць і аказваць вам паслугі па капітальным рамонце жылля, праектаванні, правядзенні інжынерных даследаванняў. Гатовы будаваць пад ключ, пастаўляць вам ліфтавае абсталяванне. Ведаю, што ў любым горадзе Беларусі і Расіі ў гэтым патрэба ёсць. Мы можам паспяхова дапаўняць у аграпрамысловым комплексе адно аднаго», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны падкрэсліў: усё, што называў, гатовы рабіць пад ключ, а не проста гандляваць. «Не без гэтага. Але вы павінны разумець, што прадаць — гэта адно. Стварыць на сумеснай вытворчасці, спраектаваць, пабудаваць нешта з сацыяльных, прамысловых аб'ектаў пад ключ мы можам узяцца і несці адказнасць. Мы ведаем, што па суадносінах цана/якасць канкурэнтаў нам у свеце будзе цяжка знайсці. Усе хочуць зарабіць велізарную суму і хутчэй пабудаваць, няважна, як. А мы людзі адказныя, у нас магутны дзяржаўны сектар. Мы яго не развалілі. З-за таго, што дзяржава стаіць за спінай дзяржкампаній, будаўнічых трэстаў, яны нясуць і адпаведную адказнасць», — адзначыў Прэзідэнт і гарантаваў поўную адказнасць нашых і прыватных, і дзяржаўных кампаній у гэтай справе.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Губернатар Курскай вобласці Раман СТАРАВОЙТ** адзначыў, што ў Беларусь прыехала маштабная дэлегацыя. У яе складзе — больш за 40 чалавек: наменнікі губернатара, кіраўнікі профільных камітэтаў, дэпартаментаў, рэктары ўніверсітэтаў, кіраўнікі прадпрыемстваў і холдынгаў.

«Мы гэтымі днямі працуем па розных кірунках. Канешне, наведалі выстаўку «Белагра». Сёння будзем працаваць на пляцоўцы форуму, прысвечанай ІТ-тэхналогіям. Гэта нашы асноўныя перспектыўныя кірункі. Я наведаў прадпрыемствы машынабудавання Беларусі. Сустрэўся з іх кіраўнікамі. Для нас як аграрнага рэгіёна вельмі важна сёння мець магчымасць набываць сельскагаспадарчую тэхніку сусветных стандартаў, якая ствараецца сёння ў краіне», — сказаў Раман Старавойт.

Цікавасць мае для гасцей і дарожнабудаўнічая, рамонтная тэхніка. У гэтым годзе, дадаў суразмоўца, на будаўніцтва дарог, бальніц, рамонт грамадскіх прастораў вобласці выдзелена сем мільярдаў расійскіх рублёў.

«На гэта ўсё неабходна абсталяванне і тэхніка, якую мы ўжо сёння набываем у Беларусі. Плануем гэта рабіць і далей», — заўважыў губернатар.

Асабліва ўразіла яго наведванне Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі. Гэты праект ён назваў унікальнай з'явай. «Комплексаў такога ўзроўню ў Еўропе няма дакладна. У асноўным гэты рынак трымаюць нашы калегі з Кітая. Упершыню яны перадалі сваю тэхналогію. Мы ўбачылі, што за кароткія тэрміны гэты праект рэалізаваны. Радасна заўважыць, што сыравінай для выпуску амінакіслот і вітамінаў будзе пшаніца і соевы шрот, вырашчаны на тэрыторыі Курскай вобласці. Ужо 150 тысяч тон высакаякаснага збожжа знаходзіцца ў элеватарах карпарацыі», — паведаміў кіраўнік дэлегацыі.

Азнаёміліся госці і з новымі мадэлямі беларускага грамадскага транспарту. Ён за дзесяць гадоў ужо сябе зарэкамендаваў сярод пасажыраў рэгіёна. Гэтым часам куране прыступаюць да трохгадовага праекта поўнага абнаўлення грамадскага транспарту. «Сёння ёсць праблемы з пастаўкай камплектуючых з-за мяжы. Вытворцы Рэспублікі Беларусь раней задумаліся пра імпартазамяшчэнне. І сёння ў вас па цане грамадскі транспарт выгаднейшы, чым у іншых вытворцаў. Мы ўважліва глядзім і разлічваем, што пастаўкі будуць здзейснены да нас», — паведаміў Раман Старавойт.

Кантракт на набыццё пакуль не падпісаны, але губернатар запэўніў: купляць грамадскі транспарт у Беларусі будуць. Як ён заўважыў, канкрэтныя планы супрацоўніцтва абмяркуюць і з кіраўніцтвам урада Беларусі.

«Які кірунак ні вазьмі, у нас усюды ёсць узаемадзеянне», — рэзюмаваў старшыня дэлегацыі.

---

Блізкая ўлада

# «ЗАДАЧА ДЗЯРЖАВЫ ЗАСТАЕЦЦА НЯЗМЕННАЙ — СТВАРАЦЬ УМОВЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ ГРАМАДЗЯН, СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ ІХ ЗАПЫТЫ»

**Учора ў Мінску пачаў сваю работу двухдзённы рэспубліканскі семінар-нарада «Актуалізацыя метадаў і форм работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні». Актуальныя пытанні абмяркоўваліся на шасці тэматычных секцыях. Але на пачатку ўдзельнікі семінара сабраліся ў Палацы Рэспублікі, дзе іх вітаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. «Якія перыпетыі ні адбываліся б каля нашых меж, які б ціск на краіну ні аказвалі знешнія сілы, задача дзяржавы застаецца нязменнай — ствараць умовы для годнага жыцця грамадзян, слухаць і чуць іх запыты. Менавіта ў гэтым залог народнага даверу, без якога не можа быць прарыўнога развіцця краін», — падкрэсліў ён, звяртаючыся да прысутных.**



Фота БелТА.

Удзельнікі адной з секцый семінару пабывалі на ААТ «БЕЛАЗ».

Па словах Ігара Сергеенкі, тэхналогіі, якія імкліва змяняюцца, пераўтвараюць наша грамадства. Як вынік — з боку грамадзян расце патрабавальнасць да ўзроўню паслуг, якія аказваюцца дзяржавай. Таму мэта сустрэчы прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў — крытычна прааналізаваць стан спраў у рабоце з насельніцтвам, выпрацаваць канкрэтныя прапановы па яе ўдасканаленні, абмяняцца вопытам.

«Новая якасць грамадства патрабуе новай якасці дзяржаўнага кіравання, павышэння ініцыятыўнасці і гнуткасці ў дзейнасці ўлады. У маштабах краіны ў гэтым напрамку зроблены першы крок — прыняты змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія замацавалі новы грамадскі дагавор паміж грамадзянамі і дзяржавай. Захоўваючы сацыяльныя гарантыі, культурныя і гістарычныя каштоўнасці, Асноўны Закон краіны стварае ўмовы для развіцця самабытнай мадэлі кіравання грамадскімі справамі, дзе грамадзяне і дзяржава ўзаемадзейнічаюць на ўмовах узаемнай сацыяльнай адказнасці», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён нагадаў прысутным словы Прэзідэнта, які ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ў студзені гэтага года заўважыў, што «ў новых канстытуцыйных рэаліях імкліва мяняецца трэба будзе і нашай дзяржаве, і грамадскім інстытутам, а сучасная сістэма кіравання павінна стаць манеўранай, наступальнай, прагматычнай — арыентаванай на апераджэнне і эфектыўнае вырашэнне праблем».

Ігар Сергеенка звярнуў увагу, што цяпер патрэбна актуалізацыя форм і метадаў работы з насельніцтвам на мясцовым узроўні. Па яго словах, гэта закранае шырокі спектр пытанняў.

Работа семінара прадоўжылася па тэматычных секцыях. Пасяджэнне секцыі № 3 «Аб рабоце дэпутацкага корпуса, органаў мясцовага самакіравання з насельніцтвам і напрамках яе ўдасканалення» прайшло ў Савеце Рэспублікі. Удзел у ім прыняла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**. Вітаючы ўдзельнікаў семінара, яна падкрэсліла, што актуальнасць тэмы работы з насельніцтвам з году ў год толькі ўзрастае. Таму што гэта асноўнае ў рабоце дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў. Савет Рэспублікі, як орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, займаецца гэтымі пытаннямі самым сур'ёзным чынам.

«Я заўсёды казала, што работа з насельніцтвам у нашай краіне выбудавана належным чынам. Па-мойму, ні ў адной краіне свету няма такой сур'ёзнай, сістэмнай работы, якая праводзіцца ў нашай краіне. Гэта розныя формы і метады — дыялогавыя пляцоўкі, грамадскія прыёмныя, прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы па асабістых пытаннях, шэраг іншых форм і метадаў, якія выкарыстоўваем сёння мы, органы дзяржаўнай улады, для работы з насельніцтвам», — сказала Наталля Качанава. Па яе словах, гэта знаходзіць разуменне ў людзей, але няма мяжы дасканаласці. І правядзенне семінара-нарады сведчыць аб тым, што гэта работа патрабуе пастаяннага ўдасканалення.

«Мы спадзяёмся, што семінар-нарада надасць новы дынамізм у гэтай працы, таму што, яшчэ раз паўтаруся, праблемы і недахопы ў гэтай працы мы бачым. Нам ёсць над чым працаваць, каб гэта было на карысць нашай краіны і нашага народа, як патрабуе ад нас Прэзідэнт нашай краіны. Ён заўсёды гаворыць аб тым, што ўсе рашэнні, якія прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржавы. І ў нашай краіне, як Прэзідэнт сказаў, улада народная. А народная ўлада жыве клопатамі аб сваіх людзях», — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Сёння пытанні актуалізацыі работы з насельніцтвам працягнуць абмяркоўваць на самым высокім узроўні. Пра гэта мы падрабязна раскажам у найбліжэйшым нумары «Звязды». А рэпартаж з пасяджэння секцыі аб рабоце дэпутацкага корпуса і органаў мясцовага самакіравання — у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 11 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ПРЫДАРОЖНЫЯ АБ'ЕКТЫ ЯК МЕСЦА ДЛЯ БАЎЛЕННЯ ЧАСУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы пайшлі па нямецкім шляху развіцця аўтабанаў, калі праз кожныя 50—60 кіламетраў будуецца аб'ект з максімальным наборам паслуг, пачынаючы ад звычайнага адпачынку на шляху прыпынку да набыцця тавараў у дарогу і магчымасці пераначаваць у гасцініцы. На галоўных магістралях краіны цяпер працуе 387 аўтазаправак, 50 гасцініц, 43 аўтамыйкі, 19 матэляў (кемпінгаў), 537 аб'ектаў харчавання, 70 пунктаў тэхнічнага абслугоўвання.

Сярод абавязковых патрабаванняў да аб'ектаў — наяўнасць стаянак: не менш як пяці месцаў для вялікагрузаў, пяці — для легкавых аўтамабіляў, двух — для аўтобусаў турыстычнага класа.

Любы прадпрымальнік, пачынаючы сваю справу, павінен разумець, у якіх умовах ён будзе працаваць, таму Міністэрства транспарту выступае за стабільную заканадаўчую базу ў гэтым кірунку, а значыць, існуючую базу трэба захоўваць.

— Чалавек, які ўкладвае свае сродкі, павінен ведаць, што яму будзе цалкам належаць пэўны аб'ект. Зямельны ўчастак выдзяляецца для выкарыстання на тэрмін ад 50 да 99 гадоў без аўкцыёну, за выключэннем прыгарада Мінска і абласных цэнтраў, дзе падобных аб'ектаў дастаткова.

У межах дарожнай карты па развіцці дарожнай інфраструктуры спецыялісты правялі своеасаблівае тэсціраванне дзясяткаў аб'ектаў, наведваючы іх як звычайныя асобы. Разглядалі з пункту гледжання зручнасці па васьмі асноўных крытэрыях: ад лёгкасці арыентавання на аб'екце, яго абазначэння і якасці абслугоўвання да чысціні санітарных збудаванняў, у тым ліку наяўнасці ў апошніх бесконтактных сродкаў (дазатараў, ракамыйнікаў, сушылак). Палова прыдарожных аб'ектаў у краіне, дарэчы, належыць замежным ці прыватным арганізацыям.

Раней людзі часцей бралі ежу з сабой у дарогу. Цяпер жа яны прыходзяць на аб'екты і хочуць паспрабаваць нейкія новыя стравы, параўнаць гатункі кавы, жадаюць нейкага руху, напрыклад, атрымаць цікавую забаву, заўважыў Сяргей Лявончык.



## ПЛАНАГРАМЫ ДЛЯ КРАМ І СТАЯНКІ ДЛЯ КАРАВАНЕРАЎ

На аўтазапраўках увага найперш удзяляецца якасці паліва і яго пастаяннай наяўнасці, кантралюецца яго дастаўка на ўсіх этапах руху: ад нафтаперапрацоўчага завода да нафтабазы і непасрэдна да АЗС. Аднак тут прапануецца і шэраг іншых паслуг, бо кіроўца на шляху хоча адпачыць, пад'есці, выпіць кавы, прывесці сябе ў парадак, заўважыў **Сяргей КАМОРНІКАЎ, намеснік генеральнага дырэктара па забеспячэнні вуглевадароднай сыравінай і рэалізацыі прадукцыі «Беларуснафты»**:

— У аб'яднанні «Беларуснафта» функцыянуе 575 аўтазаправачных комплексаў (больш як 300 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу і аб'екты, якія змешчаны ў гарадах, раённых і абласных цэнтрах). Актыўна развіваецца сістэма грамадскага харчавання — на 360 АЗС ужо ёсць кафетэрыі, а пяць гадоў таму іх было толькі 215.

Другі напрамак развіцця — гандаль. На запраўках працуе 425 крам. Для іх распрацаваны адзіныя планаграмы, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад месцазнаходжання запраўкі (на трасе ці ў горадзе). Асартымент і попыт на пэўных аб'ектах адрозніваюцца. Але абавязкова ёсць тэхнічныя вадкасці і нават пэўныя запчасткі, а таксама перакусы ў дарогу і вада.

Амаль на ўсіх запраўках (400 аб'ектах) абавязкова прысутнічае бясплатная кропка Wi-Fi і такія базавыя паслугі, як пыласос і падпампоўка шын. Хоць з апошнім існуюць пэўныя праблемы ўзімку, калі тэмпература значна паніжаецца, і не ўсё абсталяванне здольнае працаваць. Сучасныя аб'екты камплектуюць такім чынам, каб нават пры тэмпературы мінус 10 і 15 °С падпампоўка колаў і пыласос працавалі, запэўніў спецыяліст.

Спрабавалі развіваць і стаянкі для караванераў — асоб, якія падарожнічаюць на «дамах на колах». У Беларусі 19 такіх месцаў, дзе можна зарадзіць акумулятар, зліць і заправіць ваду. На некаторых запраўках ёсць аўтамыйкі і СТА, аднак гэта больш справа малога бізнесу — такія аб'екты з'яўляюцца побач з запраўкамі. На асобных АЗС ёсць пункты-дазатары, дзе можна заліць у вялікагрузы вадкасць AdBlue ці яго аналагі, што патрабуецца міжнароднымі перавозкамі.

## КАНКУРЭНЦЫЯ І МАДЭРНІЗАЦЫЯ

Практычна ўся тэрыторыя краіны пакрыта сеткай заправак, каб забяспечыць палівам усіх аўтамабілістаў. Аб'екты знаходзяцца на адлегласці 25—30 кіламетраў, таму новыя АЗС будуюцца, як правіла, калі з'яўляюцца новыя дарогі ці павялічваецца горад. Спецыялісты больш скіраваны на мадэрнізацыю аб'ектаў і абсталявання на іх, падкрэсліў Сяргей Камарнікаў.

Ёсць прыдарожныя аб'екты, якія існуюць шмат гадоў, набор паслуг у якіх не надта павялічваецца, і пэўны час людзей гэта задавальняе. Аднак калі адбываецца рэканструкцыя АЗС на гэтым участку дарогі, то хочацца больш якаснага, сучаснага, чыстага дызайну і прасторы. І падарожнікі адразу пераключаюцца на аб'екты ў складзе АЗС. Тут і стаянка, і асвятленне, і магчымасць адпачыць у вячэрні час. Фактычна, такія аб'екты становяцца пунктамі для баўлення часу мясцічамі, а старыя аб'екты адыходзяць на другі план, дадалі эксперты.

Калі ёсць канкурэнцыя, ёсць і якасць паслуг, бо ад стаўлення да спажыўца залежыць і напаўняльнасць, і запатрабаванасць імі аб'ектаў. Калі з'яўляецца новая АЗС, то некаторыя прыдарожныя аб'екты, якія маральна састарэлі, выводзяцца з ужытку, і кліенты пераключаюцца на новыя. Інфармацыю пра месцазнаходжанне, кошт і віды паліва на АЗС падарожнікі могуць, дарэчы, знайсці праз інтэрнэт, каб выбудаваць сабе адпаведны маршрут.

Дарожнікі вывучаюць трафік на дарогах, каб зразумець, ці ёсць сэнс інвеставаць грошы ў пэўныя аб'екты. Пралічваецца і грузапаток, і набыццё тавараў, і якасць абслугоўвання (для работнікаў АЗС ствараюць спецыяльныя навучальныя ролікі пра тое, як прыгатаваць страву, заправіць бак, расставіць тавар на паліцах). Калі відаць, што мадэрнізацыя аб'екта акупіцца праз сем гадоў, у яго ўкладуць грошы. Галоўная задача — развіваць сэрвіс так, каб людзі, праязджаючы па дарогах, ганарыліся ім, адзначаюць спецыялісты дарожнай галіны.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Надвор'е

# ЛЕТА «НА ЗАКАЗ» — ГЭТА КАЛІ ТЭМПЕРАТУРА НА 3—6 ГРАДУСАЎ ВЫШЭЙШАЯ ЗА НОРМУ

### Аднак у пачатку наступнага тыдня пахаладае, але не адразу

**У нашу краіну паступіла вельмі цёплая паветраная маса з паўднёвых шырот, пасля чаго ўсталявалася вельмі цёплае надвор'е з тэмпературным фонам, нашмат вышэйшым за кліматычную норму. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі неназіраюцца, толькі па паўночным захадзе, дзе размясціўся атмасферны фронт, адзначаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Вельмі цяжка будзе метэазалежным у найбліжэйшыя два дні, калі тэмпература днём будзе падымацца да 25—32 градусаў вышэй за нуль, а ўначы будзе апускацца ўсяго толькі да плюс 13—19 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сувязі з высокімі тэмпературамі паветра на 10 чэрвеня абвешчаны жоўты ўзровень небяспекі. У выхадныя захаваецца цёплае, а па паўднёвым усходзе краіны гарачае надвор'е. Аднак характар надвор'я будзе няўстойлівы: пры развіцці канвектыўнай воблачнасці па краіне чакаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы.

У пятніцу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным і заходнім раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ў разгар дня будзе падымацца да 26—32 цяпла.

У суботу нашу краіну трошкі «адпусціць», і стане свяжэй. У гэтыя суткі ўначы месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах будуць навальніцы. Уначы паветра прагрэецца да плюс 12—18 градусаў. Днём слупок тэрмометра дасягне плюс 22—28 градусаў, а па паўднёвым усходзе да плюс 29—32 градусаў. Усё, перавядзём дыханне, далей будзе лягчэй.

На наступны дзень кароткачасовыя дажджы з навальніцамі будуць ісці таксама месцамі, але вада нам на галовы пальецца ўжо больш халодная. У нядзелю тэмпература паветра ноччу складзе плюс 11—18 градусаў, а ўдзень 22—28 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе туман. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 9—15 градусаў, а ўдзень паветра прагрэецца да плюс 21—28. Гэта ўжо не 30 градусаў спякоты, але яшчэ досыць цёпла.

Канкрэтная свежасць прыйдзе да нас у аўторак. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах — навальніцы і моцныя дажджы. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, а ўдзень ад плюс 16 да плюс 23 градусаў. Плюс 23, можна плюс 25 градусаў — вось такая тэмпература ў нашай краіне папраўдзе лічыцца камфортнай.

І яшчэ. У сувязі з гарачым надвор'ем Белгідрамет нагадаў аб асноўных правілах паводзін у спякоту. «Старайцеся выбіраць для прагулак ранішні або вячэрні час. Калі ўсё ж такі трэба выйсці на вуліцу ў перыяд максімальнага прагрэву паветра, апранайце галаўны ўбор і захапіце з сабой бутэлечку з вадой. Асабліва асцярожнымі варта быць людзям з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, не забывайце ўзяць з сабой неабходныя лекі. Адпраўляючыся на вадаёмы, улічвайце, што тэмпература вады дасягнула камфортных значэнняў яшчэ далёка не ўсюды і ў рэках на сення яна складае плюс 16—22 градусы, а ў вадаёмах — плюс 18—21 градус».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Нікарагуа дазволіў прысутнасць у краіне расійскіх вайскоўцаў

Даніэль Артэга падпісаў указ, які санкцыяную часовае знаходжанне на тэрыторыі краіны вайскоўцаў іншых дзяржаў, у тым ліку расійскіх салдат. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва РІА «Навіны» са спасылкай



на газету La Gaceta. Ва ўказе адзначаецца, што прысутнасць замежных войскаў, а таксама паветраных і марскіх суднаў можа быць абгрунтавана ў гуманітарных мэтах падчас розных надзвычайных сітуацый. У прыватнасці, размова ідзе аб ваеннаслужачых цэнтральнаамерыканскіх дзяржаў, Злучаных Штатаў, Расійскай Федэрацыі, Кубы, Мексікі і Венесуэлы. Дазвол дзейнічае на перыяд, які ахоплівае другую палову гэтага года.

## Буйная нямецкая сетка супермаркетаў увяла абмежаванні на продаж макаронаў і мукі

Да такіх мер звярнулася сетка супермаркетаў Rewe з-за праблем з ланцужкамі паставак, паведаміў нямецкі партал навін Tz.de. Цяпер продаж абмяжоўваецца адной упакоўкай макаронаў і мукі на рукі, вынікае з аб'явы Rewe. Раней падобныя абмежаванні ўвялі нямецкія сеткі крам-дыскаўнтараў Aldi і Lidl. Адзначаецца, што такія прадукты, як сланечнікавы алей, мука, макаронныя вырабы і кансервы, зараз становяцца дэфіцытнымі. Сітуацыя пагаршаецца тым, што спажыўцы, асцерагаючыся адсутнасці прадуктаў і далейшага павышэння цэн, пачынаюць скупляць іх оптам. У сувязі з гэтым супермаркеты вымушаны нармаваць продаж.

## Першыя выпадкі воспы малпаў выявілі ў Бразіліі і Грэцыі

У Грэцыі хворы зарэгістраваны ў бальніцы «Андрэас Сіграс». Пацыент — мужчына, які нядаўна наведваў Партугалію, паведаміла ТАСС. Першапачатковы аналіз, праведзены ў цэнтральнай лабараторыі EODY, даў станоўчы вынік, далей даследаванне правялі ў лабараторыі мікрабіялогіі медыцынскага факультэта Салоніцкага ўніверсітэта імя Арыстоцеля. Раней у Грэцыі паведамлялася аб двух магчымых выпадках воспы малпаў у чалавека. Яны абодва не пацвердзіліся, у хворых была звычайная ветраная воспа. У Бразіліі 41-гадовы пацыент з Сан-Паўлу нядаўна падарожнічаў па Іспаніі праездам праз Партугалію. Ён знаходзіцца на каранціне ў Інстытуце інфекцыйных захворванняў імя Эміліа Рыбаса. Паводле звестак Міністэрства аховы здароўя Бразіліі, выяўлена восем патэнцыйных выпадкаў заражэння воспай малпаў па ўсёй краіне.

# ПА НОВЫЯ ЎРАЖАННІ — НА ГОМЕЛЬШЧЫНУ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння будучая святочная сталіца Добруш актыўна рыхтуецца выступіць у новым для сябе статусе. Галоўнай пляцоўкай свята стане гарадская плошча. Тут размесціцца глядзельная зала амаль на тысячу месцаў, спартыўна-гульнявая пляцоўка памерам 60 на 40 метраў, зоны для актыўнага сямейнага адпачынку. Плануецца стварыць цэнтр прыцягнення для людзей рознага ўзросту. Падарункам для жыхароў раёна, гасцей свята стане адкрыццё абноўленага спарткомплексу Добрушскай раённай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы і стадыёна са штучным пакрыццём. Акрамя таго, новыя аблічы будуць падораны жылым дамам у цэнтральнай частцы горада: на іх фасадах з'явяцца муралы. Дарэчы, актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні Добруша да Дня беларускага пісьменства возьме моладзь Гомельшчыны. У прыватнасці, студатрады дапамогуць добраўпарадкаваць асабліва папулярную ў гараджан набярэжную і зону адпачынку «Востраў». Плануецца заахвоціць да гэтай працы моладзь не толькі з Добрушскага раёна, але і з іншых раёнаў вобласці і Гомеля.

Вядома, адной з галоўных падзей праграмы стане адкрыццё ў Добрушы помніка народнаму пісьменніку Івану Шамякіну. Удзельнікаў і гасцей свята чакаюць таксама фестываль кнігі і прэсы, рэгіянальная медыявыстава, «літаратурны дворык» і музейныя экспазіцыі пад адкрытым небам. Пройдуць узнагароджанне лаўрэатаў літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага і навукова-практычная канферэнцыя.

***— Ці зможа выдатная агульнанацыянальная культурная падзея стаць дадатковым імпульсам для развіцця турыстычнага патэнцыялу Добрушскага краю і Гомельшчыны ў цэлым?***

— Безумоўна, так! І гэта вельмі важна для рэгіёна. Падчас мерапрыемстваў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства, запланаваны рэкламна-інфармацыйны тур для прадстаўнікоў турыстычнай галіны краіны і сродкаў масавай інфармацыі. Падчас экскурсіі ўдзельнікі наведаюць Добрушскую папяровую фабрыку, Добрушскі раённы краязнаўчы музей, Свята-Іаана-Кармянскі манастыр і іншыя знакавыя аб'екты. Свае работы для ўдзельнікаў і гасцей свята змогуць таксама прадставіць майстры з розных раёнаў Гомельскай вобласці. Тэматычныя інтэрактыўныя пляцоўкі падрыхтуюць адукацыйныя ўстановы горада і раёна. Усіх ахвотных таксама парадуюць крэатыўныя фотазоны і інсталяцыі, пляцоўкі спартыўнага турызму, гульнявыя праграмы і майстар-класы. Варта адзначыць, што ў Добрушскім раёне распрацаваны турыстычныя маршруты «Культавая спадчына зямлі Добрушскай», «Іаан Гашкевіч — святы зямлі беларускай», «Горад трыццаці мастоў». Гэтыя маршруты таксама будуць прадстаўлены напрыканцы рэкламна-інфармацыйнага тура, на круглым стале.

***— Уладзімір Аляксандравіч, вядома, Дзень беларускага пісьменства ў Добрушы ў тым ліку закліканы працягнуць шэраг значных мерапрыемстваў, прысвечаных асноўным ідэям Года гістарычнай памяці. Якімі падобнымі знакавымі праектамі можа сёння ганарыцца Гомельшчына?***

— Самы буйны праект, які рэалізоўваецца ў рэгіёне ў Год гістарычнай памяці, — рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка». Ён быў адкрыты ў 1983 годзе пад Гомелем, на месцы першапачатковай дыслакацыі партызанскага атрада «Бальшавік». Як вядома, разам з байцамі Чырвонай Арміі партызаны атрада ўдзельнічалі ў аперацыі «Баграціён». Пры падтрымцы падпольшчыкаў Гомеля знішчылі больш за 10 тысяч гітлераўцаў, 15 складоў боепрыпасаў і рыштунку, 150 варожых эшалонаў, вызвалілі з нямецкіх лагераў смерці больш за восем тысяч ваеннапалонных, выратавалі ад угону ў фашысцкае рабства каля пяці тысяч савецкіх грамадзян. Кіраўніцтвам Гомельскай вобласці было прынята рашэнне аб рэканструкцыі знакавага месца памяці. Праведзена маштабная работа па аднаўленні ваенна-гістарычнага комплексу ў гонар усіх партызанскіх злучэнняў нашага рэгіёна як памятнага месца пакланення гераізму і аднаго з цэнтраў ваенна-патрыятычнага выхавання. Комплекс часткова музеефікаваны, у «партызанскіх зямлянках» разгорнуцца лакальныя экспазіцыі аб побыце байцоў атрада. Наведвальнікаў чакаюць экскурсіі з інфармацыяй аб баявых дзеяннях партызанскіх фарміраванняў Гомельшчыны. Адкрыццё гэтага грандыёзнага, не толькі для Гомельшчыны, але і для ўсёй Беларусі, аб'екта плануецца прымеркаваць да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа.



**Рэчы ахвяр фашыстаў, знойдзеныя падчас пошукавых работ у Чонкаўскім лесе пад Гомелем, сталі экспанатамі ўнікальнай выставы «Бывайце, людзі...»**

Варта адзначыць, што сёлета ў рэгіёне ў рамках Года гістарычнай памяці таксама арганізаваны шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных памятным і юбілейным датам населеных пунктаў, прадпрыемстваў і арганізацый Гомельшчыны. Адзначаюцца прысваенні імёнаў герояў Вялікай Айчыннай вайны, Герояў Савецкага Саюза, знакамітых землякоў навучальным установам, студэнцкім і піянерскім атрадам, вуліцам і плошчам населеных пунктаў, распрацоўваюцца інфармацыйныя стэнды ў гонар заслужаных суайчыннікаў. Значная работа праведзена па арганізацыі выстаў архіўных дакументаў, кніжных і фотавыстаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне і Году гістарычнай памяці. Прынамсі, пры ўдзеле Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэя Шведа ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі быў прадстаўлены ўнікальны выставачны праект «Бывайце, людзі...», які дапамагае праліць святло на палітыку нямецкіх акупацыйных улад у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Гомелі па генацыдзе беларускага народа. Адзін з самых каштоўных матэрыялаў выставы — арыгінальная нямецкая фатаграфія часоў акупацыі расстрэлу мірных жыхароў Гомеля. Большасць экспанатаў прадстаўлены ўпершыню. Гэта ў тым ліку і рэчы, знойдзеныя падчас пошукавых работ 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Беларусі ў лесе Чонкаўскага лясніцтва Гомельскага раёна. Нагадаю, што пошукавыя работы на месцы масавага знішчэння мірнага насельніцтва падчас нямецкай акупацыі арганізаваны ў рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, заведзенай Генеральнай пракуратурай Беларусі. Між тым выставачны праект «Бывайце, людзі...» мабільны і цяпер экспануецца ў рэгіёнах вобласці. Усяго за некалькі месяцаў толькі ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі гэтую выставу наведала амаль 30 тысяч чалавек.

***— У Год гістарычнай памяці якія цікавыя падыходы вылучаюцца ў рабоце ўстаноў культуры рэгіёна?***

— Асноўныя акцэнты, безумоўна, — на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне гістарычнай праўды, духоўна-маральных і культурных традыцый беларускага народа. Так, творчым калектывам, майстрам і рамеснікам Гомельшчыны пашчасціла прадстаўляць рэгіён у мерапрыемствах другога сезона культурна-спартыўнага фестывалю «Вытокі. Ступень на Алімп» у Рэчыцы і XIII Рэспубліканскім фестывалі-кірмашы народных мастацкіх промыслаў «Вясновы букет» у Мінску, у праграме VIII Рэспубліканскага свята майстроў і рамеснікаў «Гомельская вясна» XXIII Міжнароднай выставы «Вясна ў Гомелі». Хары і салісты Гомельскай вобласці дастойна прадставілі рэгіён у праграме XVI Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Ветэраны душой не старэюць» у Мінску. Таксама творчыя сем'і Гомельскай вобласці прынялі ўдзел у VI Рэспубліканскім фестывалі сямейнай творчасці «Жыць у радасць» у Слоніме. Творчыя калектывы і выканаўцы, майстры народных промыслаў і прадстаўнікі розных нацыянальных дыяспар Гомельшчыны прадставілі наш рэгіён на мерапрыемствах XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне.

Варта адзначыць, што для павышэння культуры чытання, папулярызацыі культурна-асветніцкай дзейнасці бібліятэк у Гомелі адбыўся кніжны фестываль #ЧЫТАЙГОМЕЛЬ. Яго наведвальнікі змаглі прыняць удзел у сустрэчах з пісьменнікамі і паэтамі, наведаць кніжны кірмаш, прэзентацыі новых кніг, літаратурныя і гульнявыя пляцоўкі для дзяцей, конкурсы, квэсты, фотазоны і творчыя майстэрні, канцэртную праграму.

***— Рэперныя кропкі сацыяльнай сферы рэгіёна...***

— Як неаднаразова адзначаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, павышэнне эфектыўнасці эканомікі — гэта толькі інструмент для пераўтварэння Беларусі ў дзяржаву для народа. Таму найважнейшым прыярытэтам для Гомельшчыны, як і для ўсёй краіны, з'яўляецца рэалізацыя сацыяльнай палітыкі. Адным з асноўных для нас напрамкаў застаецца развіццё сістэмы адукацыі рэгіёна, якая ўключае каля тысячы двухсот устаноў, у тым ліку восем ВНУ, і прэстыж навучальных устаноў рэгіёна толькі расце.

Дарэчы, летась па выніках цэнтралізаванага тэсціравання выпускнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Гомельшчыны занялі першае месца ў краіне. Па выніках заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды бягучага года навучэнцы рэгіёна атрымалі 114 дыпломаў. Гэта дазволіла заняць II каманднае месца сярод абласцей.

Між тым рэгіён забяспечвае выкананне ўсіх дзяржаўных сацыяльных стандартаў у такім важным кірунку, як ахова здароўя. Інтэнсіўна развіваюцца перадавыя напрамкі медыцыны — трансплантaлогія, кардыялогія і кардыяхірургія, анкалогія, траўматалогія і артапедыя, нейрахірургія, афтальмалогія... Практычна ўвесь спектр аператыўных умяшанняў на сэрцы сёння выконваецца кардыяхірургамі вобласці. Разам з тым, вядома, здароўе — гэта не толькі адсутнасць хвароб, але і гарманічны духоўны, фізічны, сацыяльны дабрабыт людзей. На Гомельшчыне перакананы, здароўе — гэта спорт! Прынамсі, работа сеткі адукацыйных і спартыўных устаноў вобласці дае магчымасць развіваць 50 відаў спорту, 30 з якіх уключаны ў алімпійскую праграму. Сярод найбуйнейшых спартыўных збудаванняў міжнароднага ўзроўню ў рэгіёне — лядовы Палац спорту, цэнтральны стадыён, Палац лёгкай атлетыкі, коннаспартыўны манеж у Гомелі і спартыўна-аздараўленчы гарналыжны комплекс у Мазыры. Невыпадкова Гомельшчына — адзін з лідараў у краіне ў спорце найвышэйшых дасягненняў.



Фота БелТА.

**Міжнародны фестываль «Кліч Палесся» – адна з візітовак Гомельшчыны.**

***— Як, на вашу думку, міжрэгіянальныя сувязі сёння спрыяюць развіццю адукацыі, навукі і спорту, узбагачаюць культурную прастору паўднёва-ўсходняга беларускага рэгіёна?***

— Гомельскія вучоныя, выкладчыкі і іх калегі з суседніх рэгіёнаў рэгулярна абменьваюцца вопытам, удзельнічаюць у семінарах і канферэнцыях. Традыцыйныя міжнародныя сустрэчы педагагічнай супольнасці, якія праходзяць у форме адкрытага дыялогу аб дасягненнях і эфектыўных шляхах вырашэння новых прафесійных задач, што стаяць перад сістэмамі адукацыі розных краін. Нашы турысты і краязнаўцы з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі штогадовых міжрэспубліканскіх злётаў турысцка-патрыятычных клубаў «Мы славяне!», а таксама адкрытых спаборніцтваў «Школа бяспекі», якія праводзяцца ў Навазыбкаве. На іх адпрацоўваюцца практычныя навыкі і ўменні паводзін у экстрэмальных умовах. Пры гэтым спаборніцтвы садзейнічаюць фарміраванню гатоўнасці падрастаючага пакалення да абароны Айчыны, выхоўваюць любоў і павагу да Радзімы. Апроч адукацыйных праграм, актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў сферы турызму, спорту і фізічнай культуры. Вялікую цікавасць у замежных гасцей выклікаюць нашы санаторыі «Прыдняпроўскі», «Чонкі», «Залатыя пяскі», «Сярэбраныя ключы», Жлобінскі аквапарк, Мазырскі гарналыжны комплекс і іншыя аздараўленча-спартыўныя аб'екты. Спартсмены з замежных краін заўсёды запрашаюцца для правядзення міжнародных турніраў і адкрытых рэгіянальных спаборніцтваў. Так, напрыклад, у рамках падпісанага 21 красавіка бягучага года пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне фізічнай культуры і спорту паміж упраўленнем спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама і ўпраўленнем фізічнай культуры і спорту Бранскай вобласці ў верасні запланаваны фестываль футбола з удзелам каманд гарадоў Унеча, Клінцы і Бранск.

Нагадаю таксама, што Гомельшчыну па праве называюць унікальным рэгіёнам не толькі з-за маляўнічай прыроды беларускага Палесся, але і з-за багатай гістарычнай і культурнай спадчыны. Штогод мы праводзім значную колькасць мерапрыемстваў, многія з якіх сталі сапраўднымі брэндамі рэгіёна. Фестывалі рознага ўзроўню збіраюць на Гомельшчыне гасцей не толькі з Беларусі, але і з-за мяжы. Сярод адметных міжнародныя фэсты — фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (сёлета прымеркаваны да 880-годдзя, пройдзе ў Гомелі з 9 да 11 верасня і збярэ каманды гарадоў-пабрацімаў) і «Славянскія тэатральныя сустрэчы», рэспубліканскія фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» і народнага гумару «Аўцюкі». Сёлета ў мэтах падтрымкі самадзейных цыркавых калектываў, захавання пераемнасці прафесійнага цыркавога мастацтва і самадзейных цыркавых калектываў, развіцця і прапаганды найлепшых дасягненняў цыркавога мастацтва ў Гомелі быў праведзены І Міжнародны фестываль самадзейнага цыркавога мастацтва. У ім прынялі ўдзел цыркавыя калектывы Беларусі і Расіі. У аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна 20 жніўня сёмы раз пройдзе Міжнародны фестываль «Кліч Палесся». У праграму фестывалю будуць уключаны тэматычныя мерапрыемствы, якія таксама падтрымаюць асноўныя нацыянальныя пасылы Года гістарычнай памяці.

**Гутарыла
Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Час кіно

# «ВЯЛІКАЯ ПЕРАМЕНА» СВЯТКУЕ 50-ГОДДЗЕ

**У суботу ў эфіры сацыякультурнага канала зможам убачыць фільм рэжысёра Аляксея Коранева, які знялі ў 1972 годзе. Бліскучая меладрама пра вучняў вячэрняй школы зрабіла зоркамі многіх маладых акцёраў.**



Тут зняліся Ралан Быкаў, Яўгеній Леонаў, Аляксандр Збруеў, Святлана Кручкова, Людміла Касаткіна і іншыя артысты, чые імёны сталі гістарыяй многіх вядомых і любімых кінастужак. Што датычыцца «Вялікай перамены», то фільм стварылі па матывах аповесці Георгія Садоўнікава «Іду да людзей». Паводле сюжэта, малады аспірант-гісторык Нестар Севераў у запале ад сваркі з каханай дзяўчынай вырашае пакінуць навуку і ідзе працаваць у вячэрнюю школу. Там яго ставяць класным кіраўніком 9 «А». І, спачатку далёкі ад усяго, што адбываецца навокал, паступова Нестар Пятровіч пачынае захапляцца працай і ўнікаць у клопаты сваіх дарослых вучняў. Герой кінастужкі ўвесь час трапляе ў розныя камічныя сітуацыі з-за таго, што вучні яго альбо равеснікі, альбо старэйшыя за яго. Аднак прыстойнасць, дабрыня і любоў да прафесіі дапамагаюць настаўніку завяваць аўтарытэт сярод тых, за каго ён у адказе. А ўзаемаадносіны з вучнямі вучаць яго жыццю, што ў выніку дапамагае яму вярнуцца да сваёй навесты...

Дарэчы, спачатку фільм хацелі назваць «Прыгоды школьнага настаўніка», але калі ў Міністэрстве адукацыі такая назва выклікала незадавальненне, то аператар Анатоль Мукасей прапанаваў варыянт «Вялікая перамена». Што да прэтэндэнтаў на галоўную ролю (якая ў выніку дасталася Міхаілу Конанаву) у кінастужцы, то тут сябе спрабавалі таксама Канстанцін Райкін і Андрэй Мягкоў. Аднак апошні адмовіўся, паколькі рэжысёр не пагадзіўся здымаць яго жонку Анастасію Вазнясенскую. Што да здымак, то многія эпізоды былі адзняты на «Масфільме», а школьныя сцэны з'явіліся ў сценах Маскоўская педагагічнага універсітэта. Таму, калі ёсць жаданне згадаць любімыя эпізоды фільма і дыялогі яго герояў, а таксама ўспомніць, які было жыццё паўстагоддзя таму, не прапусціце кінасеанс на «Беларусь 3» 11 чэрвеня.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 167

Усе сённяшнія пазіцыі складзены вядучым аддзела.

№ 74



**№ 74**
**Белыя простыя:** e1, e3, g5, b6, h6, c7 (6)
**Чорныя простыя:** h2, a3, h4, a5, e5, f8 (6)
**№ 75**
**Белыя простыя:** e1, b6, c7, g7 (4)
**Чорныя простыя:** h2, b4, d4, a5, e5, h8 (6)
**№ 76**
**Белыя простыя:** f2, c3, b4, d4, h4, e5 (6)
**Чорныя простыя:** h2, g5, f6, c7, e7,g7 (6)
**№ 77**
**Белыя простыя:** b2, f2, g3, f4, h4, c5, g5 (7)
**Чорныя простыя:** h2, a3, d6, f6, e7, g7, f8 (7)
**№ 78**
**Белыя простыя:** c1, g3, f4, h4, c5, b6, h6 (7)
**Чорныя простыя:** h2, a3, b4, e5, d6, e7, d8 (7)

Наступныя кампазіцыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

**№ 79**
**Белыя простыя:** e1, g1, h2, e3, f4, g5 (6)
**Чорныя простыя:** b2, c3, g3, c5, h6, c7, e7, g7 (8)
**№ 80**
**Белыя простыя:** a1, e1, g1, h2, f4, g5 (6)
**Чорныя простыя:** b2, a3, c3, g3, h6, c7 (6)
**№ 81**
**Белыя простыя:** e1, g1, h2, f4, g5 (5)
**Чорныя простыя:** b2, c3, g3, h6, e7, g7 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 166 ад 27.05.22.

№ 67 1.f4-e5 f6:d4 2.g1-f2 e3:g1 3.d6-e7 f8:d6 4.h6:c5 g1:b6 5.a7:c5 + (ЧПР 4. h6:b6! Указаў С. Бурко.)

№ 68 1. c3-b4 f4:d2 2. c5-d6 c7:e5 3 .a7-b8 a3:c5 4. b8:e1+

№ 69 1. c5-b6 a5:c3 [ 1... a3:c5 2. b6:a1 g3-h2 3. a7:g1 ] 2. b6:b4 a3:c5 3. a7:a1+

№ 70 1. c3-b4 a3:e7 2. c7-d8 f4:d6 3. h6:f4 g3:e5 4. d8:g1 +

№ 71 1. 11-07 01:21 2. 16:29 28:19 3. 42-37 31:42 4. 47:38 36:47 5. 29-24 47:20 6. 15:02 +

№ 72 1. 17-12 26:08 2. 13:02 04:33 3.02-35 38:49 4. 49:40 5.35:15 + Поўнае пабочнае рашэнне: 1. 50-44 38:40 2. 29-24 20:29 3. 17-12 26:8 4. 13:2 4:24 5. 2:35:49:27:36:47 29-34 6. 47-33 +, знайшоў С. Бурко.

№ 73 1. 24-19 38:40 2. 17-12 26:08 3. 13:02 35:13 4. 02:47 28-32 5. 47-20 32-37

[ 5...23-28 6. 20-42 32-37 7. 42:31 28-33 8. 31-27 33-39 9. 27-49 ]

6. 20-14 23-29 7. 14:41 29-33 8. 41-32 33-39 9. 32-49 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), В. Арцюхін, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

***«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013» e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru***

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# «БЕЛАРУСЬ 3» СУСТРЭНЕЦЦА З ГЛЕДАЧАМІ Ў МАЛАДЗЕЧНЕ

**У дні правядзення XXI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2022» 10 і 11 чэрвеня гледачоў сацыякультурнага тэлеканала чакаюць прэм'еры, шэраг рэпартажаў і інтэрв'ю, а наведвальнікаў культурнага форуму — тэматычныя сустрэчы з творчай групай «Беларусь 3». Сёння ўвечары глядзіце прамую трансляцыю ўрачыстага адкрыцця, а заўтра ў вячэрнім эфіры тэлегледачы змогуць убачыць гала-канцэрт закрыцця фэсту «Настальгічны дывертысмент».**

Як паведамляе афіша фэстывалю, у час урачыстага адкрыцця адбудзецца ўзнагароджанне лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні, а пасля ўвазе аўдыторыі будзе прадстаўлена канцэртная праграма «XXI — адлік новага часу. Пачатак» у выкананні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі». Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — Максім Расоха. Удзел у мерапрыемстве таксама возьме шэраг вядомых беларускіх артыстаў, сярод якіх Вікторыя Алешка, Ірына Дарафеева, Дзмітрый Карачоўскі, Наталля Тамела, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» і лаўрэаты Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні.



А на наступны дзень на канцэрце закрыцця фестывалю запланаваны выступленні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча з праграмай «Песні вяртаюцца», ансамбля «Сябры», гурта «Аўра», ансамбля «Чараўніцы», артыстаў Алены Ланской, Аляксандра Саладухі, фольк-бэнду «Неруш» і іншых. Выступіць тут і пераможца шоу «Х-Фактар. Беларусь» Андрэй Панісаў. Таму плануйце свае вечары з разлікам усё ж не прапусціць прамыя трансляцыі Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2022» і атрымаць асалоду ад сустрэчы з любімымі выканаўцамі.

Насычаныя фестывальныя дні «Беларусь 3» правядзе разам з жыхарамі і гасцямі Маладзечна. У праграме культурнага форуму — адразу некалькі актыўнасцяў, падрыхтаваных тэлеканалам. Так, сёння на вялікім экране кінатэатра «Радзіма» — паказ дакументальнай стужкі «Імправізацыя», прысвечанай памяці Міхаіла Фінберга — стваральніка і ідэйнага натхняльніка фестывалю ў Маладзечне. Як адзначыла сцэнарыст фільма Надзея Габец, у ходзе яго падрыхтоўкі каманда тэлеканала сабрала мноства жывых успамінаў: 17 інтэрв'ю, 700 хвілін — іх хапіла б на паўнавартасны цыкл фільмаў!

У мясцовым Палацы культуры ў фестывальныя дні можна будзе ўбачыць фотавыставу, прысвечаную эпізодам стварэння тэлепраекта «Жывая спадчына», лаўрэата прафесійнай прэміі «Тэлевяршыня-2022». У суботу, 11 чэрвеня, таксама на базе культурнай установы ў 14.00 (з нагоды 10-годдзя музычна-пазнавальнага праекта «Наперад у мінулае») адбудзецца творчая сустрэча з яго аўтарамі. Першы юбілей праграмы, якая ў вандроўках па ўсёй краіне пры дапамозе фальклорных калектываў і прафесійных музыкаў ствярае аўдыятэку народных беларускіх песень у сучасной аранжыроўцы, адзначаецца выхадам пяцісотай кампазіцыі. Яна прагучыць упершыню, у жывым выкананні і ў сяброўскім коле на сустрэчы з вядучай праграмы Аксанай Вечар і рэжысёрам Анатолем Вечарам, аранжыроўшчыкамі і народнымі калектывамі. Спецыяльныя госці — заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Наталля Тамела і Алена Ланская.

А самыя яскравыя моманты фестывальных дзён, рэпартажы з тэматычных пляцовак, сустрэчы з удзельнікамі і гасцямі прапануюць гледачам тэлеканала «Беларусь 3» карэспандэнты праграмы «Навіны культуры».

**Алена ДРАПКО.**


## «Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 17 ліпеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 апрысквальнікаў садовых «Жук Класік» ОП-207/0444 (8 літраў) і суперпрыз — трымер электрычны Oasis TE-50. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 30 ліпеня 2022 года.

